Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя П.М. Машэрава"
Кафедра беларускай літаратуры

**Г.В. Навасельцава**

# МЕТОДЫКА ДЗЕЙНАСЦІ ЛІТАРАТУРНА-РЭДАКЦЫЙНАГА СУПРАЦОЎНІКА

***Метадычныя рэкамендацыі***

*Віцебск*
*ВДУ імя П.М. Машэрава*
*2015*

Репозиторий ВГУ

УДК 070.41(076.5)
ББК 76.024.91я73
Н15

Друкуецца па рашэнні навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”. Пратакол № 3 ад 03.03.2015 г.

Аўтар: старшы выкладчык кафедры беларускай літаратуры ВДУ імя П.М. Машэрава, кандыдат філалагічных навук **Г.В. Навасельцава**

Р э ц э н з е н т :
загадчык кафедры літаратуры ВДУ імя П.М. Машэрава,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт *В.В. Лапацінская*

**Навасельцава, Г.В.**
**Н15** Методыка дзейнасці літаратурна-рэдакцыйнага супрацоўніка : метадычныя рэкамендацыі / Г.В. Навасельцава. – Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2015. – 20 с.

Метадычныя рэкамендацыі адрасаваны студэнтам спецыяльнасці “Беларуская філалогія (літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць)” дзённай формы навучання. Складзены ў адпаведнасці з патрабаваннямі агульнаадукацыйнага стандарта і вучэбнай праграмы па дысцыпліне.

**УДК 070.41(076.5)**
**ББК 76.024.91я73**

© Навасельцава Г.В., 2015
© ВДУ імя П.М. Машэрава, 2015

Репозиторий ВГУ

## ЗМЕСТ

I. УСТУП …………………………………………………………………… 4
II. АСНОЎНЫ ЗМЕСТ МОДУЛЯЎ ……….…………………................. 5
III. ЛІТАРАТУРА ……………………………………………….................... 10
IV. ТЭСТЫ ДЛЯ САМАКАНТРОЛЮ ………………………………… 12
V. ПЫТАННІ ДА ТЭАРЭТЫЧНАГА ЭТАПА ЭКЗАМЕНУ ……….. 19

Репозиторий ВГУ

# I. УСТУП

Вучэбная дысцыпліна “Методыка дзейнасці літаратурна-рэдакцыйнага супрацоўніка” з’яўляецца адным з кампанентаў сістэмы філалагічнай адукацыі, адлюстроўвае сучасны стан, асноўныя тэндэнцыі развіцця сродкаў масавай інфармацыі і дзейнасці літаратурна-рэдакцыйнага супрацоўніка (журналіста) як суб’екта творчага працэсу.

Мэта выкладання дысцыпліны – даць студэнтам трывалыя веды пра агульныя заканамернасці і працэсы літаратурна-рэдакцыйнай (журналісцкай) дзейнасці. Прафесійная падрыхтоўка будучых супрацоўнікаў СМІ патрабуе вырашэння наступных задач: навучыць будучых спецыялістаў самастойна працаваць у рэдакцыйным калектыве; сфарміраваць уменне выкарыстоўваць тэарэтычныя веды ў практычнай дзейнасці; сфарміраваць уяўленне пра структуру творчага працэсу, сістэму сродкаў маўленчай выразнасці ў медыя-тэксце.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен ведаць:

– агульныя заканамернасці творчай дзейнасці літаратурна-рэдакцыйнага супрацоўніка;
– асаблівасці працы з журналісцкім творам;
– асноўныя метады збору інфармацыі;
– адрозненні журналісцкай і літаратурна-мастацкай творчасці.
– У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен умець:
– аналізаваць журналісцкі тэкст на розных узроўнях;
– прымяняць атрыманыя веды пры напісанні ўласных твораў;
– выкарыстоўваць у журналісцкіх матэрыялах разнастайныя сродкі маўленчай выразнасці.

Метадычныя рэкамендацыі “Методыка дзейнасці літаратурна-рэдакцыйнага супрацоўніка” адрасаваны студэнтам II курса спецыяльнасці “Беларуская філалогія (літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць)” дзённай формы навучання, складзены ў адпаведнасці з патрабаваннямі агульнаадукацыйнага стандарта і вучэбнай праграмы па дысцыпліне. Курс разлічаны на 52 гадзіны, з іх 48 аўдыторныя (30 гадзін – лекцыйныя заняткі, 18 гадзін – практычныя).

Репозиторий ВГУ

## II. АСНОЎНЫ ЗМЕСТ МОДУЛЯЎ

## МОДУЛЬ 1 ТЭКСТ ЯК АСНОЎНЫ ПРАДУКТ ДЗЕЙНАСЦІ ЛІТАРАТУРНА-РЭДАКЦЫЙНАГА СУПРАЦОЎНІКА

### ТЭМА 1 УЗАЕМАДЗЕЯННЕ РОЗНЫХ ВІДАЎ ЛІТАРАТУРНАЙ ТВОРЧАСЦІ

Тэарэтычная частка

1. Журналістыка і публіцыстыка: азначэнне, функцыі, тэматыка, жанравая палітра.
2. Агульная характарыстыка СМІ Рэспублікі Беларусь.
3. Інфармацыйная культура сучаснага грамадства.
4. Прафесійныя абавязкі літаратурна-рэдакцыйнага супрацоўніка (журналіста).

Практычная частка

5. Ахарактарызуйце інфармацыйна-тэматычную палітру любімага выдання (на выбар).
6. Вызначце тэму, пра якую вам хацелася б пісаць. Збярыце факты і звесткі, звязаныя з цікавай для вас тэмай. Вызначце ў ёй галоўнае і другараднае.
7. Напішыце эсэ на тэму “Журналіст у сучасным свеце” або “Наша інфармацыйнае стагоддзе”.
8. Сфармулюйце асноўныя “запаведзі” літаратурна-рэдакцыйнай (журналісцкай) дзейнасці.

### ТЭМА 2 МАСАВАЯ ІНФАРМАЦЫЯ Ў ЛІТАРАТУРНА-РЭДАКЦЫЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Тэарэтычная частка

1. Розныя віды інфармацыі. Асноўныя крыніцы інфармацыі літаратурна-рэдакцыйнага супрацоўніка (журналіста).
2. Факт у журналістыцы, мастацкай публіцыстыцы, літаратурна-мастацкай творчасці. Асноўныя прынцыпы адбору фактаў для журналісцкага твора.
3. Навіна і сенсацыя. Фактары папулярнасці (эфектыўнасці) журналісцкага твора.
4. Методыка працы над публіцыстычным творам.

Практычная частка

5. Складзіце спіс кампетэнтных крыніц інфармацыі ў вашым горадзе (раёне).
6. Прааналізуйце журналісцкі тэкст, дзе закранаецца важная праблема. На аснове якіх фактаў пабудаваны тэкст? Ці дастаткова гэтых



Репозиторий ВГУ

фактаў для раскрыцця тэмы? На колькі выразна выяўлена праз факты пазіцыя аўтара?

7. Напішыце эсэ на тэму “Навіны – наша прафесія”.
8. Выканайце тэст камунікатыўных здольнасцей.

## ТЭМА 3 БУДОВА ЖУРНАЛІСЦКАГА ТВОРА. ПРАЦА ЛІТАРАТУРНА-РЭДАКЦЫЙНАГА СУПРАЦОЎНІКА З ЗАГАЛОВАЧНЫМ КОМПЛЕКСАМ

Тэарэтычная частка

1. Віды загалоўкаў на газетнай паласе.
2. Функцыі загаловачнага комплексу.
3. Правілы для загалоўкаў у друкаваных СМІ і ў інтэрнэт-выданні.
4. Віды лідаў, іх функцыі.

Практычная частка

5. Прааналізуйце загалоўкі ў рэспубліканскіх і (або) рэгіянальных перыядычных выданнях. Адзначце найбольш удалыя.
6. Прапануйце свае варыянты загалоўкаў да асноўных матэрыялаў нумару.
7. Знайдзіце інфармацыйныя і аналітычныя матэрыялы з лідам. Вызначце тыпы лідаў, ацаніце іх дарэчнасць і выразнасць.
8. Знайдзіце аналітычны артыкул у рэспубліканскім выданні. Назавіце пяць-сем ключавых слоў, якія вызначаюць яго змест. На падставе ключавых слоў напішыце новы варыянт ліда да матэрыялу.

## ТЭМА 4 БУДОВА ЖУРНАЛІСЦКАГА ТВОРА. ПРАЦА ЛІТАРАТУРНА-РЭДАКЦЫЙНАГА СУПРАЦОЎНІКА З КАМПАЗІЦЫЯЙ

Тэарэтычная частка

1. Патрабаванні да кампазіцыі літаратурна-рэдакцыйнага (журналісцкага) тэксту.
2. Тыповыя віды кампазіцыі.
3. Функцыянальна-сэнсавыя тыпы маўлення ў працэсе творчай дзейнасці літаратурна-рэдакцыйнага супрацоўніка (журналіста).
4. Індывідуальны стыль аўтара. Сродкі маўленчай выразнасці.

Практычная частка

5. Стварыце падрабязны план работы над тэмай будучай публікацыі. Вызначце кола крыніц інфармацыі.
6. Уважліва прааналізуеце змест аднаго нумару трох розных газет (рэспубліканскіх або рэгіянальных). Выпішыце адтуль інфармацыю пра любых вядомых асоб, якія прыцягнулі вашу ўвагу. У адвольнай форме стварыце ўласны тэкст пра цікавага чалавека. Тэкст павінен утрымліваць цытаты, спасылкі, каментарыі. Паспрабуйцеся зрабіць яго запамінальным.



Рэпазіторый ВГУ

7. Прапануйце ўласную методыку працы над літаратурна-рэдакцыйным (журналісцкім) тэкстам.

8. Складзіце правілы рэдагавання ўласных тэкстаў.

## МОДУЛЬ 2 ЖАНРАВАЯ ПАЛІТРА Ў ТВОРЧАСЦІ ЛІТАРАТУРНА-РЭДАКЦЫЙНАГА СУПРАЦОЎНІКА

### ТЭМА 1 АСНОЎНЫЯ ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ ЖАНРЫ ЛІТАРАТУРНА-РЭДАКЦЫЙНАЙ (ЖУРНАЛІСЦКАЙ) ТВОРЧАСЦІ

Тэарэтычная частка

1. Паняцце жанру ў журналістыцы. Жанраўтваральныя фактары ў СМІ рознай тыпалогіі.

2. Адметнасць працы над матэрыяламі розных жанраў і мэтавая аўдыторыя СМІ.

3. Асновы навасційнай, праблемна-аналітычнай, мастацка-публіцыстычнай журналістыкі.

4. Спецыфіка інфармацыйных жанраў (на прыкладзе рэпартажу і (або) інтэрв’ю).

5. Заметка як інфармацыйны жанр СМІ

Практычная частка

6. На аснове аператыўных звестак папулярных інтэрнэт-сайтаў падрыхтуйце замекі пра важныя грамадска-сацыяльныя падзеі.

7. Падрыхтуйце рэпартаж на выбраную вамі культурную тэму (наведайце выставу ў любым музеі, паглядзіце любы тэатральны спектакль і г.д.).

8. Падрыхтуйце і правядзіце інтэрв’ю-гульню “Рэпарцёр атрымаў заданне…”.

### ТЭМА 2 АСНОЎНЫЯ АНАЛІТЫЧНЫЯ ЖАНРЫ ЛІТАРАТУРНА-РЭДАКЦЫЙНАЙ (ЖУРНАЛІСЦКАЙ) ТВОРЧАСЦІ

Тэарэтычная частка

1. Сістэма аналітычных жанраў СМІ.

2. Асноўныя жанраўтваральныя прыкметы карэспандэнцыі.

3. Артыкул як асноўны аналітычны жанр.

4. Асноўныя жанраўтваральныя прыкметы партрэтнага інтэрв’ю, праблемнага інтэрв’ю.

5. Каментарый як прыём і як жанр журналісцкай творчасці.

Практычная частка

6. Прааналізуйце артукул у рэспублікаскім выданні. Звярніце ўвагу на асноўныя прыкметы аналітычнага матэрыялу.



Репозиторий ВГУ

7. Знайдзіце на старонках рэспубліканскіх выданняў партрэтнае і праблемнае інтэрв'ю. Зрабіце іх кампаратыўны аналіз.

8. Напішыце каментарый на актуальную для маладзёжнай аўдыторыі тэму.

## ТЭМА 3 АСНОЎНЫЯ МАСТАЦКА-ПУБЛІЦЫСТЫЧНЫЯ І ЛІТАРАТУРНА-КРЫТЫЧНЫЯ ЖАНРЫ Ў ДЗЕЙНАСЦІ РЭДАКЦЫЙНАГА СУПРАЦОЎНІКА

Тэарэтычная частка

1. Мастацкая публіцыстыка і літаратурная крытыка ў сучасных СМІ.
2. Адметнасць спецыялізаванага гумарыстычна-сатырычнага выдання.
3. Галоўныя характарыстыкі замалёўкі, нарыса, эсэ.
4. Фельетон і памфлет у сучаснай журналістыцы.
5. Жанры літаратурна-мастацкай крытыкі.

Практычная частка

6. Знайдзіце і прааналізуйце нарыс на старонках сучаснага друку.
7. Напішыце фельетон на любую актуальную тэму.
8. Напішыце рэцэнзію на любы твор сучаснай літаратуры.

## ТЭМА 4 АСНОЎНЫЯ МЕТАДЫ АТРЫМАННЯ ІНФАРМАЦЫІ І ПРАЦЫ З ІНФАРМАЦЫЯЙ ЛІТАРАТУРНА-РЭДАКЦЫЙНАГА СУПРАЦОЎНІКА (ЖУРНАЛІСТА)

Тэарэтычная частка

1. Адкрытыя метады атрымання інфармацыі.
2. Схаваныя метады атрымання інфармацыі.
3. Метад канстатацыі ў працы з інфармацыяй.
4. Эсэісцкі метад у працы з інфармацыяй.
5. Метад дзелавой аналітыкі ў працы з інфармацыяй.

Практычная частка

6. Знайдзіце ў друкаваных СМІ матэрыялы, для стварэння якіх быў выкарыстаны метад "уключанага назірання".
7. Знайдзіце ў друкаваных СМІ матэрыялы, для стварэння якіх быў выкарыстаны метад "арганізаваны эксперымент".
8. Знайдзіце ў друкаваных СМІ матэрыялы, для стварэння якіх быў выкарыстаны інтэрв'ю-метад.

Репозиторий ВГУ

## ТЭМА 5 АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА МАЎЛЕННЯ ЛІТАРАТУРНА-РЭДАКЦЫЙНАГА СУПРАЦОЎНІКА (ЖУРНАЛІСТА)

Тэарэтычная частка

1. Інфармацыйнае поле і інфармацыйная норма ў СМІ. Публіцыстычны стыль і газетна-публіцыстычны падстыль.
2. Маўленчая сітуацыя ў Рэспубліцы Беларусь і яе ўплыў на мову СМІ.
3. Багацце маўлення літаратурна-рэдакцыйнага супрацоўніка (журналіста) як сведчанне майстэрскага валодання словам.
4. Маўленчыя сродкі ўздзеяння на свядомасць: стылістычныя фігуры і тропы.
5. Інтэртэкстуальнасць як моўна-стылёвая прыкмета сучаснай публіцыстыкі.

Практычная частка

6. Прааналізуйце выбраны газетны матэрыял на прадмет выкарыстання стылістычных фігур.
7. Прасачыце тэндэцыі метафарызацыі мовы СМІ на прыкладзе любога перыядычнага выдання.
8. Прааналізуйце выбранае выданне на прадмет выкарыстання ў ім інтэртэкстуальнасці.

## ТВОРЧАЯ ПРАЦА ДЛЯ ВЫНІКОВАГА КАНТРОЛЮ

1. Выканайце рэдакцыйнае заданне для ўніверсітэцкай газеты “Мы і час”.
2. Напішыце эсэ на тэму “Маё першае рэдакцыйнае заданне”.
3. Зрабіце публікацыю ў жанры інтэрв’ю ва ўніверсітэцкай газеце “Мы і час” (або рэгіянальным выданні).
4. Напішыце замалёўку на тэму “Калі б быў рэдактарам…”.
5. Прапануйце ўласную тэму і зрабіце па ёй публікацыю ва ўніверсітэцкай газеце “Мы і час” (або любым рэгіянальным выданні).
6. Напішыце эсэ “Мая тэма ў журналістыцы”.
7. Падрыхтуйце рэпартаж для ўніверсітэцкай газеты “Мы і час” (або рэгіянальнага выдання).
8. Напішыце заметку пра моўную палітру выбранага вамі раённага або рэспубліканскага перыядычнага выдання.
9. Падрыхтуйце эсэ “Індывідуальны стыль журналіста – гэта…”.
10. Напішыце замалёўку з выкарыстаннем экспрэсіўна-вобразных сродкаў.

Рэпазіторый ВДУ

# III. ЛІТАРАТУРА

## Асноўная

1. Ахмадулин, Е.В. Основы теории журналистики / Е.В. Ахмадулин. – Ростов н/Д: Феникс, 2009. – 350 с.

2. Ворошилов, В.В. Журналистика / В.В. Ворошилов. – СПб.: Изд-во Михайлова В.А., 1999. – 304 с.

3. Корконосенко, С.Г. Основы журналистики / С.Г. Корконосенко. – М.: Аспект Пресс, 2001. – 287 с.

4. Лазутина, Г.В. Основы творческой деятельности журналиста : учеб. для вузов по специальности «Журналистика» / Г.В. Лазутина. – М.: Аспект пресс: Изд-во Моск. ун-та, 2000. – 238 с.

5. Основы творческой деятельности журналиста / под ред. С.Г. Корконосенко. – СПб.: Знание, 2000. – 272 с.

6. Самарцев, О.Р. Творческая деятельность журналиста : очерки теории и практики : учеб. пособие / О.Р. Самарцев. – М.: Академический проект: Гаудеамус, 2009. – 526 с.

7. Черникова, Е.В. Основы творческой деятельности журналиста : учеб. пособие / Е.В.Черникова. – М.: Гардарики, 2005. – 287 с.

8. Цікоцкі, М.Я. Стылістыка беларускай мовы : вучэб. дапам. для фак. журналістыкі / М.Я. Цікоцкі. – Мінск: Універсітэцкае, 1995. – 294 с.

9. Цікоцкі, А.М. Стылістыка газетных жанраў: дапам. для студ. журналісцкіх спец. / А.М. Цікоцкі. – Мінск: БДУ, 2003. – 23 с.

## Дадатковая

1. Асновы культуры маўлення і стылістыкі : вучэб. дапам. для студэнтаў філал. фак. ВНУ / У.В. Анічэнка, У.Д. Еўтухоў, В.А. Ляшчынская, Т.І. Тамашэвіч. – Мінск: Універсітэцкае, 1992. – 255 с.

2. Берёзкина, О.П. Социально-психологическое воздействие СМИ / О.П. Берёзкина. – М.: Академия, 2009. – 240 с.

3. Богомолова Н.Н. Социальная психология массовой коммуникации / Н.Н. Богомолова. – М.: Аспект Пресс, 2008. – 191 с.

4. Воробьев, В.П. Система СМИ Беларуси / В.П. Воробьев. – Минск: БГУ, 2002. – 167 с.

5. Доценко, Е.Л. Психология манипуляции: феномены, механизмы и защита / Е.Л. Доценко. – СПб.: Речь, 2003. – 304 с.

6. Дубовік, С.В. Даведнік журналіста / С.В. Дубовік. – Мінск: Беларус. дзярж. ун-т, 2006. – 221 с.

7. Іўчанкаў, В.І. Дыскурс беларускіх СМІ: арганізацыя публіцыстычнага тэксту / В.І. Іўчанкаў. – Мінск: Беларус. дзярж. ун-т, 2003. – 256 с.

8. Калмыков, А.А. Интернет-журналистика : учеб. пособие / А.А. Калмыков, Л.А. Коханова. – М.: ЮНИТИ-ДАНА, 2005. – 383 с.

Репозиторий ВГУ

9. Криницин, Е. Акулы интервью: 11 мастер-классов / Е. Криницин. – М. : Альпина Паблишерз, 2011. – 182 с.

10. Колесниченко, А.В. Практическая журналистика: учеб. пособие / А.В. Колесниченко. – М.: Изд-во Моск. ун-та, 2010. – 192 с.

11. Корконосенко, С.Г. Теория журналистики : моделирование и применение / С.Г. Корконосенко. – М.: Логос, 2010. – 248 с.

12. Мельник, Г.С. Методы журналистики: учеб. пособие / Г.С. Мельник, М.Н. Ким. – СПб.: Изд-во Михайлова В.А., 2008. – 272 с.

13. Мельник, Г.С. Основы творческой деятельности журналиста / Г.С. Мельник, А.Н. Тепляшина. – СПб.: Питер, 2009. – 272 с.

14. Мирошниченко, А. Когда умрут газеты / А. Мирошниченко. – М.: Книжный мир, 2011. – 224 с.

15. Олешко, В.Ф. Журналистика как творчество / В.Ф. Олешко. – М.: МГУ, 2003. – 178 с.

16. Олешко, В.Ф. Психология журналистики / В.Ф. Олешко. – СПб.: Изд-во Михайлова В.А., 2008. – 240 с.

17. Свитич, Л.Г. Введение в специальность : профессия : журналист / Л.Г. Свитич. – М.: Аспект Пресс, 2007. – 255 с.

18. Пронина, Е.Е. Психология журналистского творчества / Е.Е. Пронина. – М. КДУ, 2006. – 368 с.

19. Рощин, С.К. Психология и журналистика / С.К. Рощин. – М.: Наука, 1989. – 192 с.

20. Соловьев, А.И. Основы информационно-коммуникационной деятельности / А.И. Соловьёв. – Минск: БГУ, 2009. – 191 с.

21. Сосновская А.М. Журналист: личность и профессионал (психология идентичности) / А.М. Сосновская. – СПб.: Роза мира, 2005. – 206 с.

22. Студенческая журналистика: метод. рекомендации / О.М. Самусевич [и др.]. – Минск: БГУ, 2010. – 71 с.

23. Шостак, М.И. Репортер: профессионализм и этика / М.И. Шостак. – М.: РИП-холдинг, 2001. – 165 с.

Репозиторий ВГУ

## IV. ТЭСТЫ ДЛЯ САМАКАНТРОЛЮ

**1. Лід-каламбур найчасцей сустракаецца на старонках**

спецыялізаванай прэсы; масавай прэсы; якаснай прэсы; элітарнай прэсы.

**2. Загаловак у форме пытання характэрны для**

інфармацыйных жанраў; аналітычных жанраў; мастацка-публіцыстычных жанраў; любых жанравых форм.

**3. Для так званых "мяккіх" навін (займальных, але не асабліва аператыўных) рэкамендуецца**

лід-апавяданне; лід-цытата; "прамы" лід; "зацяжны" лід.

**4. Ацэначная функцыя найчасцей выразна дамінуе ў загалоўку**

літаратурна-крытычнага матэрыялу; публіцыстычнага матэрыялу; інфармацыйнага матэрыялу; крытычнага матэрыялу.

**5. Для апісання чалавека ў драматычнай сітуацыі найбольш падыходзіць жанр**

каментарыя; рэпартажа; замалёўкі; нарыса.

**6. Адбор навін для публікацыі на першай паласе адбываецца паводле**

запатрабаванняў аўдыторыі; значэння падзеі; густаў рэдактара; густаў журналіста.

**7. Для таго, каб ацаніць падзею ў грамадска-палітычным кантэксце, найлепш падыходзіць жанр**

рэпартажа; экспертнага інтэрв'ю; палемічнага артыкула; агульнадаследчага артыкула.

**8. Для паведамлення пра надзвычайную падзею найбольш падыходзіць структура будовы твора паводле**

"перавёрнутай піраміды"; "пясочнага гадзінніка"; "прамой" піраміды; "прамой" і "перавёрнутай піраміды".

**9. Для "ажыўлення" навіны найлягчэй выкарыстаць**

прыклады, якія робяць падзею больш нагляднай; прыём рэпартажнай замалёўкі; акцэнтаванне аўтарскай пазіцыі; аўтарскі каментарый.

**10. Найважнейшыя структурныя элементы журналісцкага тэксту**

загаловак – лід – асноўная частка; загаловак – лід – "канцоўка"; загаловак – лід; лід – асноўная частка – "канцоўка".

**11. Каментарыйныя загалоўкі лічацца няўдалымі пры іх выкарыстанні**

ў аналітычных тэкстах; у інфармацыйных тэкстах; у публіцыстычных тэкстах; у творах літаратурнай крытыкі.

**12. Задачу ўтрымаць увагу чытача выконвае**

загаловак; лід; рубрыка; "канцоўка".

Рэпазіторый ВДУ

**13. Цытата будзе прыдатнай і можна быць эфектыўна выкарыстана для завяршэння**

заметкі; рэпартажа; артыкула; нарыса.

**14. Інфармацыйную і кантактную функцыі выконвае**

рубрыка; загаловак; лід; “канцоўка”.

**15. Верагоднасць прачытання больш за 90% у**

рубрыкі; загалоўка; ліда; “канцоўкі”.

**16. Іронія, пародыя, травесція, парадокс як стылістычныя прыёмы ўласцівы для**

інтэрв’ю; каментарыя; рэпартажа; фельетона.

**17. Цытату героя журналісцкага твора найчасцей выносяць у загаловак**

размовы; партрэтнага інтэрв’ю; інфармацыйнага інтэрв’ю; аналітычнага інтэрв’ю.

**18. Галоўным паказчыкам эфектыўнасці працы журналіста выступае**

хуткасць напісання матэрыялаў; колькасць “правальных” матэрыялаў; уменне пісаць складаныя аналітычныя тэксты; уменне якасна рэдагаваць тэксты.

**19. Так званая “ньюсмейкерская” журналістыка блізкая па функцыянальнаму напаўненню**

да рэкламнай дзейнасці; да PR-дзейнасці; да публіцыстычнай дзейнасці; да літаратурна-крытычнай дзейнасці.

**20. Асновай навасційнага журналісцкага твора выступае**

каментарый; факт; меркаванне; сведчанне.

**21. Журналіст, які пастаянна вядзе пэўную рубрыку, – гэта**

аналітык; калумніст; публіцыст; эсэіст.

**22. Выкарыстанне іроніі найчасцей ператварае эсэ ў**

памфлет; фельетон; нарыс; замалёўку.

**23. Развіццю самапазнання чытачоў, пераадоленню стэрэатыпаў масавай свядомасці найперш садзейнічае**

аналітыка; эсэістыка; фельетаністыка; нарысістыка.

**24. Адной з умоў практычнай эфектыўнасці маркетынгу СМІ выступае**

адсутнасць свабодных рыначных адносін; канкурэнтная барацьба СМІ за ўвагу аўдыторыі; перавышэнне попытам прапановы; суразмернасць попыту і прапановы.

**25. Калі сістэматычна выкарыстоўваюцца прыёмы па прыцягненні ўвагі для паведамленняў, якія пастаянна паўтараюцца, – то гэта**

PR-дзейнасць; прапаганда; публіцыстыка; рэклама.

**26. Скіраванасць на ўздзеянне і перакананне найбольш уласціва**

аналітычным тэкстам; публіцыстычным тэкстам; інфармацыйным тэкстам; рэкламным тэкстам.



Рэпазіторый ВГУ

**27. Журналісцкі твор фактычна перапісваецца пры правядзенні**

праўкі-вычыткі; праўкі-перастварэння; праўкі-скарачэння; праўкі-апрацоўкі.

**28. ТАП-метадам (Тэма-Асацыяцыі-Пытанні) рэкамендуецца карыстацца**

для збору інфармацыі; для пошуку новай тэмы; для праверкі інфармацыі; для пошуку крыніц інфармацыі.

**29. Асноўнай інфармацыі пра падзею і звестак пра яе дэталі, а таксама інфармацыі, непасрэдна не звязанай з падзеяй, але паказальнай для разумення яе сутнасці, дастаткова, каб напісаць**

хранікальную заметку; дэталізаваную заметку; стандартную заметку; рэпартаж.

**30. Тэрмін *mass media* найбольш блізкі да паняцця**

сродкі масавай камунікацыі; сродкі масавай інфармацыі; каналы масавай камунікацыі; каналы масавай інфармацыі.

**31. Від літаратуры, прысвечаны абмеркаванню актуальных сацыяльных пытанняў з мэтай прамога ўздеяння на грамадскую думку, – гэта**

прапаганда; публіцыстыка; журналістыка; PR-дзейнасць.

**32. Грунтавалася на філасофскіх ідэях абсалютнай улады манарха**

лібертарыянская тэорыя прэсы; аўтарытарная тэорыя прэсы; тэорыя сацыяльнай адказнасці; лібертарыянская тэорыя прэсы і аўтарытарная тэорыя прэсы.

**33. Рэлігійна-клерыкальны тып журналістыкі сфарміраваўся ў рэчышчы**

лібертарыянскай тэорыі прэсы; аўтарытарнай тэорыі прэсы; тэорыі сацыяльнай адказнасці і лібертарыянскай тэорыі прэсы; тэорыі сацыяльнай адказнасці.

**34. З філасофскіх ідэй рацыяналізму і натуральных правоў чалавека паходзіць**

аўтарытарная тэорыя прэсы; лібертарыянская тэорыя прэсы; тэорыя сацыяльнай адказнасці і лібертарыянская тэорыя прэсы; тэорыя сацыяльнай адказнасці.

**35. Кодэксам прафесійнай этыкі журналіста надаецца вялікае значэнне ў практычнай дзейнасці паводле прынцыпаў**

аўтарытарнай тэорыі прэсы; тэорыі сацыяльнай адказнасці; лібертарыянскай тэорыі прэсы; лібертарыянскай тэорыі прэсы і аўтарытарнай тэорыі прэсы.

**36. Галоўныя мэты СМК – інфармаваць, забаўляць аўдыторыю, прадаваць інфармацыю, але найперш пераводзіць канфлікт у межы дыскусіі, – характэрныя для**

аўтарытарнай тэорыі прэсы; тэорыі сацыяльнай адказнасці; лібертарыянскай тэорыі прэсы; лібертарыянскай тэорыі прэсы і тэорыі сацыяльнай адказнасці.



Репозиторий ВГУ

**37. З’ява “аб’ектыўнага рэпартажа” зарадзілася ў рэчышчы**

аўтарытарнай тэорыі прэсы і тэорыі сацыяльнай адказнасці; тэорыі сацыяльнай адказнасці; лібертарыянскай тэорыі прэсы; аўтарытарнай тэорыі прэсы.

**38. Неабходнасць абароны рэпутацыі асобы стала актуальнай праблемай у практычным выяўленні**

аўтарытарнай тэорыі прэсы і тэорыі сацыяльнай адказнасці; лібертарыянскай тэорыі прэсы; тэорыі сацыяльнай адказнасці; аўтарытарнай тэорыі прэсы.

**39. Аўтарскае права на твор, які напісаны ў ходзе выканання службовага задання, належыць**

журналісту і рэдактару; журналісту; рэдактару; рэдакцыі выдання.

**40. Найменш ужывальны жанр у сучасным друку – гэта**

карэспандэнцыя; фельетон; рэпартаж; эсэ.

**41. Найбольш ужывальны жанр у сучасным друку – гэта**

інтэрв’ю; заметка; рэпартаж; артыкул.

**42. Аналітычны жанр, у якім даецца ацэнка мастацкага або навуковага твора, – гэта**

агляд СМІ; рэцэнзія; нарыс; артыкул.

**43. Традыцыйна публіцыстыка разумецца як найвышэйшая ступень праяўлення**

паэтычнай творчасці; журналісцкай творчасці; літаратурна-крытычнай творчасці; літаратурна-мастацкай творчасці.

**44. Адлюстраванне і фарміраванне грамадскай думкі выступае галоўнай функцыяй**

журналістыкі; публіцыстыкі; прапаганды; мастацкай літаратуры.

**45. Мае на мэце стварэнне іміджу і фарміраванне харызматычнага вобразу асобы**

журналістыка; PR-дзейнасць; літаратурная крытыка; публіцыстыка.

**46. Выхаваўча-асветніцкая функцыя яскрава праяўляецца ў сферы**

PR-дзейнасці; журналісцкай творчасці; прапаганды; публіцыстычнай творчасці.

**47. Каналы распаўсюджвання масавай інфармацыі – газеты, часопісы, радыё, тэлебачанне, інфармацыйныя агенцтвы абазначаюцца тэрмінам**

“камунікатывістыка”; “журналістыка”; “медыявістыка”; “публіцыстыка”.

**48. Спецыфічны від дзейнасці, які ўключае ў сябе мэтаскіраванае даследаванне канкурэнтнага асяроддзя, чытацкай аўдыторыі, рэкламнага рынку, а таксама пошукаў шляхоў “прасоўвання” СМІ на рынак – гэта**

рэдакцыйны менеджмент; рэдакцыйны маркетынг; фінансавая дзейнасць рэдакцыі; маркетынг і менеджмент.

Репозиторий ВГУ

**49. Пастаяннае вывучэнне тыражнасці выдання, перыядычнасці выхаду ў свет, геаграфіі распаўсюджання, кошту аднаго экзэмпляра, спосабаў продажу выдання, тэматыкі і зместу публікацый, структуры рубрык, дызайну выдання, дынамікі чытацкіх запатрабаванняў – гэта**

менеджмент; маніторынг; агляд СМІ; маркетынг.

**50. Кароткае (20 – 30 хвілін) выступленне перад прэсай па свежых слядах важных падзей – гэта**

прэс-канферэнцыя; брыфінг; “круглы стол”; інтэрв’ю.

**51. Пазбаўлены інтэрактыўнасці, мультымедыйнасці, гіпертэкстуальнасці кантэнт у фармаце**

Web 1.0; Web 2.0; Web 3.0; Web 4.0.

**52. Падзея ў дынамічным развіцці найчасцей можа выступаць асновай**

аўтарскага блога; онлайнавага рэпартажа; інтэрнэт-канферэнцыі; мультымедыйнага артыкула.

**53. У выніку калектыўнай працы вэб-журналістаў з’яўляецца публікацыя, дзе шырока выкарыстоўваюцца розныя мультымедыйныя сродкі, – гэта**

інфармацыйная заметка; мультымедыйны артыкул; онлайнавы рэпартаж; аўтарскі блог.

**54. Тэлекамунікацыі, рэкламная справа, PR-дзейнасць традыцыйна ўключаюцца ў сферу**

медыявістыкі; камунікатывістыкі; журналістыкі; публіцыстыкі.

**55. Такі прынцып дзеяння СМІ, як развіццё нацыянальнай культуры, прадпісаны**

Законам Рэспублікі Беларусь “Аб рэкламе”; Законам Рэспублікі Беларусь “Аб сродках масавай інфармацыі”; “Кодэксам прафесійнай этыкі журналіста” БСЖ; “Міжнароднай дэкларацыяй прынцыпаў паводзін журналіста”.

**56. Адкрытае грамадска-палітычнае пазнанне, асваенне і адлюстраванне рэчаіснасці ў найбольшай меры выяўляецца праз**

фактаграфічны метад; публіцыстычны метад; аналітычны метад; наглядна-вобразны метад.

**57. Пранікненне ў сутнасць падзеі, абагульненне звестак адбываецца дзякуючы выкарыстанню**

фактаграфічнага метада; аналітычнага метада; публіцыстычнага метада; наглядна-вобразнага метада.

**58. Выступае як базавы ў аналітычнай працы з інфармацыяй**

метад канстатацыі; метад інтэрпрэтацыі; метад дзелавой аналітыкі; эсэісцкі метад.

**59. Выступае асноўным пры падрыхтоўцы матэрыялаў у інфармацыйных жанрах**

метад інтэрпрэтацыі; метад канстатацыі; метад дзелавой аналітыкі; эсэісцкі метад.

Репозиторий ВГУ

**60. Пры напісанні рэцэнзіі на літаратурны твор рэкамендуецца скарыстаць**

метад інтэрпрэтацыі; метад дзелавой аналітыкі; метад канстатацыі; эсэісцкі метад.

**61. Свабоднае аўтарскае самавыяўленне выразна прасочваецца пры звароце да**

метада інтэрпрэтацыі; эсэісцкага метада; метада дзелавой аналітыкі; публіцыстычнага метада.

**62. Выступае асноўным пры падрыхтоўцы матэрыялаў у аналітычных жанрах**

эсэісцкі метад; метад інтэрпрэтацыі; метад дзелавой аналітыкі; публіцыстычны метад.

**63. Выступае асноўным пры падрыхтоўцы матэрыялаў у мастацка-публіцыстычных жанрах**

метад інтэрпрэтацыі; эсэісцкі метад; метад дзелавой аналітыкі; публіцыстычны метад.

**64. Жанравую прыналежнасць публікацыі найперш выяўляюць**

адлюстраваная ў матэрыяле тэма; сукупнасць структурна-кампазіцыйных сродкаў; закранутая ў матэрыяле праблема; вобразна-выяўленчыя сродкі.

**65. Да інфармацыйных жанраў адносіцца**

артыкул; рэпартаж; эсэ; нарыс.

**66. Да аналітычных жанраў адносіцца**

заметка; каментарый; фельетон; памфлет.

**67. Да мастацка-публіцыстычных жанраў адносіцца**

заметка; эсэ; каментарый; артыкул.

**68. Аператыўны жанр перыядычнага друку, які выразна і сцісла фіксуе канкрэтны жыццёвы факт**

замалёўка; заметка; рэпартаж; інтэрв'ю.

**69. Для таго, каб хутка паведаміць актуальную навіну, найперш прызначаны жанр**

замалёўкі; заметкі; рэпартажа; эсэ.

**70. Фіксуе і раскрывае навіну ў агульных рысах**

хранікальная заметка; стандартная заметка; дэталізаваная заметка; сінтэзаваная заметка.

**71. Факт звычайна суправаджаецца элементам каментарыю ў**

хранікальнай заметцы; сінтэзаванай заметцы; стандартнай заметцы; дэталізаванай заметцы.

**72. Звычайна называюць вобразнай інфармацыяй**

заметку; замалёўку; нарыс; рэпартаж.

**73. Звычайна называюць мастацкім дакументам**

заметку; рэпартаж; карэспандэнцыю; замалёўку.

**74. Ярка раскрываюцца асобныя рысы герояў падзеі ў**

эсэ; партрэтнай замалёўцы; карэспандэнцыі; рэпартажы.



Репозиторий ВГУ

**75. “Эфект суперажывання” паглыблена выяўляецца ў**

карэспандэнцыі; рэпартажы; эсэ; замалёўцы.

**76. Блізкі да нарыса інфармацыйны жанр – гэта**

карэспандэнцыя; замалёўка; рэпартаж; справаздача.

**77. Палемічным характарам найчасцей вызначаецца**

калектыўнае інтэрв’ю; размова; аналітычнае інтэрв’ю; інтэрв’ю-замалёўка.

**78. Карыстацца прыёмам “закрытае пытанне + адкрытае пытанне” рэкамендуецца пры правядзенні**

інфармацыйнага інтэрв’ю; партрэтнага інтэрв’ю; аналітычнага інтэрв’ю; размовы.

**79. Інфармацыйны жанр, аб’ектам адлюстравання якога выступае калектыўнае мерапрыемства, – гэта**

рэпартаж; справаздача; заметка; інтэрв’ю.

**80. Акрыўна выкарыстоўваюцца элементы рэпартажа і замалёўкі ў**

рэцэнзіі; карэспандэнцыі; артыкуле; справаздачы.

Репозиторий ВГУ

## V. ПЫТАННІ ДА ТЭАРЭТЫЧНАГА ЭТАПА ЭКЗАМЕНУ

1. Журналістыка і публіцыстыка: азначэнне, функцыі, тэматыка, жанравая палітра.
2. Агульная характарыстыка СМІ Рэспублікі Беларусь.
3. Інфармацыйная культура сучаснага грамадства.
4. Прафесійныя абавязкі літаратурна-рэдакцыйнага супрацоўніка (журналіста).
5. Розныя віды інфармацыі. Асноўныя крыніцы інфармацыі літаратурна-рэдакцыйнага супрацоўніка (журналіста).
6. Факт у журналістыцы, мастацкай публіцыстыцы, літаратурна-мастацкай творчасці. Асноўныя прынцыпы адбору фактаў для журналісцкага твора.
7. Навіна і сенсацыя. Фактары папулярнасці (эфектыўнасці) журналісцкага твора.
8. Віды загалоўкаў на газетнай паласе. Функцыі загаловачнага комплексу.
9. Правілы для загалоўкаў у друкаваных СМІ і ў інтэрнэт-выданні.
10. Віды лідаў, іх функцыі.
11. Патрабаванні да кампазіцыі літаратурна-рэдакцыйнага (журналісцкага) тэксту. Тыповыя віды кампазіцыі.
12. Функцыянальна-сэнсавыя тыпы маўлення ў працэсе творчай дзейнасці літаратурна-рэдакцыйнага супрацоўніка (журналіста).
13. Індывідуальны стыль аўтара. Сродкі маўленчай выразнасці.
14. Паняцце жанру ў журналістыцы. Жанраўтваральныя фактары ў СМІ рознай тыпалогіі.
15. Адметнасць працы над матэрыяламі розных жанраў і мэтавая аўдыторыя СМІ.
16. Асновы навасційнай, праблемна-аналітычнай, мастацка-публіцыстычнай журналістыкі.
17. Спецыфіка інфармацыйных жанраў (на прыкладзе рэпартажу і (або) інтэрв'ю).
18. Заметка як інфармацыйны жанр СМІ
19. Сістэма аналітычных жанраў СМІ.
20. Асноўныя жанраўтваральныя прыкметы карэспандэнцыі.
21. Артыкул як асноўны аналітычны жанр.
22. Асноўныя жанраўтваральныя прыкметы партрэтнага інтэрв'ю, праблемнага інтэрв'ю.
23. Каментарый як прыём і як жанр журналісцкай творчасці.
24. Мастацкая публіцыстыка і літаратурная крытыка ў сучасных СМІ.
25. Адметнасць спецыялізаванага гумарыстычна-сатырычнага выдання.
26. Галоўныя характарыстыкі замалёўкі, нарыса, эсэ.



Репозиторий ВГУ

27. Фельетон і памфлет у сучаснай журналістыцы.
28. Жанры літаратурна-мастацкай крытыкі.
29. Адкрытыя метады атрымання інфармацыі.
30. Схаваныя метады актрымання інфармацыі.
31. Метад канстатацыі ў працы з інфармацыяй.
32. Эсэісцкі метад у працы з інфармацыяй.
33. Метад дзелавой аналітыкі ў працы з інфармацыяй.
34. Інфармацыйнае поле і інфармацыйная норма ў СМІ. Публіцыстычны стыль і газетна-публіцыстычны падстыль.
35. Маўленчая сітуацыя ў Рэспубліцы Беларусь і яе ўплыў на мову СМІ.
36. Багацце маўлення літаратурна-рэдакцыйнага супрацоўніка (журналіста) як сведчанне майстэрскага валодання словам.
37. Маўленчыя сродкі ўздзеяння на свядомасць: стылістычныя фігуры і тропы.
38. Інтэртэкстуальнасць як моўна-стылёвая прыкмета сучаснай публіцыстыкі.
39. Спецыфіка і функцыі медыя-тэксту.
40. Сістэма інфармавання літаратурна-рэдакцыйнага супрацоўніка (журналіста).

Репозиторий ВГУ